**ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за снежань 2019 г.

## <u>Мерапрыемствы ў рамках Сусветнага дня прафілактыкі СНІДу</u>

**2 снежня**

Інфармацыйная гадзіна «Пра гэта трэба ведаць!» прайшла для навучэнцаў старэйшых класаў у рамках сумеснага праекта бібліятэкі і кінатэатра «Вясёлка» «Книга в кадре». Арганізатары мерапрыемства звярнулі ўвагу прысутных на той факт, што толькі веды і самакантроль змогуць абараніць ад невылечнага захворвання СНІД. Завяршылася мерапрыемства праглядам тэматычнага фільма «Наркаманія. Уся праўда пра ВІЧ».

Кіселявецкая ПБ, 35 чал.

**3 снежня**

Гасцямі урока-роздуму «Символ надежды всего человечества» сталі навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа. Урач-інфекцыяніст Кобрынскай ЦРБ Кацярына Крупеня расказала, што такое ВІЧ-інфекцыя, чым яна адрозніваецца ад СНІДу, якія этапы развіцця хваробы бываюць, пазнаёміла з эпідсітуацыяй па ВІЧ-інфекцыі ў Кобрыне і Кобрынскім раёне. Святар Свята-Хрыстараждзественскай царквы айцец Андрэй расказал, як здабыць упэўненасць ва ўласных сілах, чаму самай важнай каштоўнасцю для чалавека з'яўляецца яго здароўе і ў чым заключаецца духоўнае здароўе.

Мерапрыемства суправаджалася паказам відэапрэзентацыі «Зловещая тень над миром».

ЦБ, 68 чал.

**3 снежня**

У час правядзення пасяджэння клубу «Час і ты» - урока-роздуму «СПИД: знать, чтобы бороться» навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя сферы абслугоўвання пазнаёміліся з гісторыяй захворвання, з Міжнародным сімвалам барацьбы са СНІДам - Чырвонай стужкай. Урач-валеолаг цэнтра «Арыенцір» Філіпеня В. Г. расказала пра способы перадачы віруса і правілах прафілактыцы, пазнаёміла са статыстыкай захворванняў СНІДам у Кобрыне і Кобрынскім раёне. Увазе прысутных прадстаўлена прэзентацыя «Погасшие звезды».

ЦБ, 32 чал.

## <u>Іншыя мерапрыемствы</u>

**4 снежня**

Гарадзецкі філіял Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы заняў 1 месца V Рэспубліканскага конкурсу «Библиотека – центр духовного просвещения и воспитания» у намінацыі «Семья – наследница нравственных и духовных ценностей». Грамату Беларускай праваслаўнай

царквы загадчыку Гарадзецкага філіяла уручыў Патрыяршы экзарх усяе Беларусі Павел падчас Калядных чытанняў, што праходзілі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Камплект праваслаўных кніг стаў прыемным дадаткам да граматы.
*Лауреат из Городца // Заря. – 2019. – 11 декабря. - С. 19.*
*Ефтифеева, Н. Проект-победитель / Наталья Ефтифеева // Заря. – 2019. – 14 декабря. – С. 14.*
*Ефтифеева, Н. Библиотека – центр духовности / Наталья Ефтифеева // Кобрин-информ. – 2019. – 19 декабря. – С. 14.*

**4-5 снежня**

Абласная школа дырэктараў бібліятэчных сістэм Брэсцкай вобласці прайшла на базе Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы. У мерапрыемствах школы прынялі ўдзел дырэктары бібліятэчных сістэм Брэстчыны, прадстаўнікі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, аддзела культуры Кобрынскага райвыканкама і Кобрынскага вайскова-гістарычнага музея ім. А. В. Суворава.

Асноўнымі тэмамі выступленняў сталі «Редкая книга», «Базы данных», «Основные направления работы библиотек», «Краеведение» і «Библиотека в виртуальном пространстве». Па адным з пытанняў вялася анлайн-трансляцыя з Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі ім. В. І. Леніна.

Удзельнікі школы наведалі Залескую публічную бібліятэку і пазнаёміліся з работай Гарадзецкага філіяла. Парадавала выступленнем вакальная група «Фантазія» Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі.
*Ефтифеева, Н. За опытом работы – на Кобринщину / Н. Ефтифеева // Кобрин-информ. – 2019. – 12 декабря. - с. 3.*
*Ефтифеева, Н. Библиотечная школа / Н. Ефтифеева // Заря. – 2019. – 21 снежня. - с. 5.*

**18 снежня**

У час правядзення гісторыка-краязнаўчай секцыі клуба «Універсітэт залатога веку» ў рамках праекта «Хобі-цэнтр 55 +» мастацтвазнаўца Ларыса Шчур пазнаёміла аўдыторыю з візантыйскім і рускім іканапісцам, мініяцюрыстам і майстрам манументальных фрэскавых роспісаў Феафанам Грэкам. Яна расказала пра карціны і партрэты вядомага рускага жывапісца, створаных па біблейскіх матывах. Прысутным прадстаўлена прэзентацыя пра жыццё і творчасць мастака.

ЦБ, 35 чал.

**20 снежня**

Чарговае навучанне бібліятэчных работнікаў раёна прайшло ў форме круглага стала «От идеи – к плану действий».
Адкрыла мерапрыемства дырэктар ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Ларыса Легатюк. Метадысты

прааналізавалі планы на 2020 год і разгледзелі праграмна-праектную дзейнасць публічных бібліятэк раёна. У рамках круглага стала адбылося абмеркаванне запланаваных галоўных мерапрыемстваў наступнага года. Бібліятэкар Арэхаўскай публічнай бібліятэкі падзялілася з калегамі інфармацыяй пра сайты, якія выкарыстоўвае пры афармленні ўстановы. Апошнім акордам стала ўручэнне навагодніх падарункаў старшынёй прафсаюза.

ЦБ, 56 чал.

**22 снежня**

Аматарскім тэатрам-студыяй «Піражок» у рамках праекта «Хобі-цэнтр 55 +» падрыхтаваны гумарыстычны спектакль «Кобрын - маленькі Тэль-Авіў». На прыкладзе рэальных людзей, якія жылі ў Кобрыне, самадзейныя артысты паказалі культуру, побыт і традыцыі габрэйскага народа. Цікавым момантам тэатральнага прадстаўлення стала віктарына з гледачамі.

ЦБ, 48 чал.

**26 снежня**

Гасцямі гадзіны даверу «Мы такие же, как все, только чуточку сильнее» сталі навучэнцы 9-х класаў СШ № 3 г. Кобрына.
Супрацоўнікі бібліятэкі пазнаёмілі дзяцей з біяграфіямі людзей з абмежаванымі магчымасцямі, якія дабіліся поспеху ў розных сферах жыццядзейнасці (спорце, мастацтве, літаратуры, музыцы). Завяршылася мерапрыемства праглядам відэароліка «Вопреки всему».

ЦБ, 23 чал.

## <u>Выдавецкая дзейнасць</u>

У гонар 80-годдзя з часу заснавання ААТ «Кобрынскі масларобна-сыраробны завод» бібліёграфамі цэнтральнай бібліятэкі выдадзены бібліяграфічны паказальнік «Прадукцыя кобрынская – якасць еўрапейская». Завод стаў візітнай карткай нашага горада. Сёння ААТ «Кобрынскі масларобна-сыраробны завод» - адно з найбуйнейшых прадпрыемстваў малочнай прамысловасці рэспублікі па вытворчасці цвёрдых сычужных сыроў. Выданне прадстаўляе каля 300 крыніц, уключае артыкулы з перыядычных выданняў, пачынаючы з 1968 года.

Бібліёграфамі цэнтральнай бібліятэкі у гонар 80-годдзя з часу заснавання кобрынскай бібліятэкі выдадзены рэкламна-інфармацыйны спіс «Чытай, краіна, пра нас пішуць! : бібліятэка на старонках СМІ». Спіс прапануе публікацыі ў друку аб рабоце Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы. Уключаны артыкулы з перыядычных выданняў на беларускай і рускай мовах за 15 апошніх гадоў (2004-2019).

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу падрыхтавана даведачнае выданне «Нацыянальная літаратурная прэмія». У выданні сабрана інфармацыя аб Нацыянальнай літаратурнай прэміі, якой узнагароджваюць аўтараў лепшых кніг у Рэспубліцы Беларусь. Пералічаны ўсе лаўрэаты па намінацыях за ўсе гады існавання прэміі. Прыводзяцца вокладкі кніг, за якія пісьменнікі атрымалі ўзнагароду.

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу падрыхтавана даведачнае выданне «Літаратурная прэмія імя У. Калесніка». У выданні сабрана інфармацыя аб прэміі, якой узнагароджваюць аўтараў лепшых кніг на Брэстчыне. Пералічаны ўсе лаўрэаты па намінацыях за ўсе гады існавання прэміі. Прыводзяцца вокладкі кніг, за якія пісьменнікі атрымалі ўзнагароду.

Па выніках творчага конкурсу «Вясёлка сугуччаў» аддзелам бібліятэчнага маркетынгу выдадзены зборнік вершаў «Свидание с Мудростью», у які ўвайшлі лепшыя конкурсныя паэтычныя творы.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81